# ДА ЗБРОІ, СЛАЎНАЯ МОЛАДЗЬ БЕЛАРУСІ!

Нямецка-фашысцкія акупанты, якія па-разбойніцку ўварваліся ў Беларусь, прынеслі з сабой масавае знішчэнне нашага народа, варварскае зруйнаванне беларускіх гарадоў і вёсак, разбурэнне народнай гаспадаркі, увядзенне рабска-прыгонніцкіх парадкаў.

Хто можа забыць замучаных, расстраляных немцамі жанчын і дзяцей у Мінску? Гітлераўскія нягоднікіператварылі Мінск у руіны. Яны пабудавалі шыбеніцы на яго плошчах, лагеры смяротнікаў у яго ваколіцах. Дзесяткі тысяч расстраляных у Мінску, звыш 20 тысяч — у Магілеве, 10 тысяч — у Пінску, звыш 6 тысяч — у Віцебску, 8 тысяч — у Шклове — вось ён «новы парадак» гітлераўскіх забойцаў.

Асабліва лютую нянавісць маюць фашысты да моладзі. Страшэнным катаванням і здзекам падвяргаюць яны маладых патрыётаў. У вёсцы Ляўкі, што паблізу Бабруйска, фашысцкія каты жывымі закапалі ў зямлю 6 камсамольцаў. У Грэскім раёне яны расстралялі комсамольца Сіроціна, а бацьку яго павесілі. Над Міхаілам Станкевічам — маладым партызанам—фашысты доўга здзекаваліся, хацелі выведаць размяшчэнне яго атрада. Але ні слова не сказаў герой. Тады каты аблілі яго бензінам і спалілі жывым на вачах у жыхароў калгаса імені Беларускай ваеннай акругі. Затым фашысты падпалілі калгас і дзесяткі дзяцей кінулі ў агонь.

Гітлераўскія нягоднікі штыкамі заганяюць нашых дзяўчат у свае публічныя дамы. Штыкамі яны гоняць беларускую моладзь на пагібель у рабочыя каманды, у канцэнтрацыйныя лагеры, гоняць на катаргу ў фашысцкую Германію. За апошні месяц толькі з Гомеля вывезена ў Германію каля двух тысяч юнакоў і дзяўчат, з Віцебска — 2500 чалавек.

***З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі***

М. ЗІМЯНІН,
сакратар ЦК ЛКСМБ.